# СТАНАЎЛЕННЕ МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ ПРАВАСЛАЎНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

*Кузьмініч М. Л.*
*(Мінск, Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі)*

Станаўленне музычнай адукацыі праваслаўнай арыентацыі на беларускіх землях непарыўна звязана з з гісторыяй беларускага народа, фарміраваннем і развіццём яго духоўнай і музычнай культуры на мяжы заходнееўрапейскіх і ўсходнеславянскіх традыцый. Багаслужэбная практыка шмат у чым вызначыла нараджэнне сістэмы музычнай адукацыі, прычым, не толькі духоўна-рэлігійнай арыентацыі, але і свецкай. Менавіта з навучаннем спевам у праваслаўных саборах звязваецца зараджэнне арганізаваных форм музычнай адукацыі на беларускіх землях.

Станаўленне візантыйскіх традыцый музычнай адукацыі бога-служэбнай арыентацыі пачалося яшчэ ў IV ст., калі ад Рымскай імперыі аддзялілася Візантыя са сталіцай у Канстанцінопалі (заснаваны ў 330 г.). Яе культура захавала традыцыі эпохі антычнасці і хрысціянства, дасягнуўшы найвышэйшага росквіту ў V–VI стст. Ад самага пачатку малітоўныя спевы з'яўляліся важнейшай складаючай набажэнства і да якасці іх мілагучнасці прад'яўляліся высокія патрабаванні. У IV ст. (369 г.) рашэннем Лаадзі-кійскага сабора да богаслужэбных спеваў у праваслаўнай царкве дапус-каліся толькі прафесійныя пеўчыя, што запатрабавала развіцця форм прафесійнай музычнай адукацыі. Усе харавыя і сольныя спевы выконваліся без суправаджэння прафесійнымі спевакамі – меладамі. Яны ж з'яўляліся і аўтарамі богаслужэбных тэкстаў, песенна-паэтычных імправізацый і гімнаў, якія ўключаліся ў праваслаўны ўжытак. Пэўная ўніфікацыя богаслужэбных спеваў адбылася ў VIII ст., калі аснову праваслаўнага набажэнства склаў звод песнапенняў вядомага спевака, паэта, багаслова і філосафа Іаана Дамаскіна (700–760 ці 675–753). Характэрнай асаблівасцю набажэнства было выкарыстанне толькі богаслужэбных спеваў (пераважна аднагалосых) без суправаджэння музычных інструментаў.

Прыхаджанам забаранялася спяваць самастойна, ім дазвалялася толькі паўтараць за царкоўным клірам.

Для падрыхтоўкі прафесійных пеўчых патрэбны былі даместыкі – настаўнікі, майстры богаслужэбных спеваў, кіраўнікі хора, якія працавалі ў кожнай царкве. Калі да IV ст. іх было па аднаму ў хоры, то пасля IV ст. – па двое. Так паступова вылучыўся інстытут настаўнікаў царкоўных спеваў, якія на гэтым этапе займаліся яшчэ і рэгенцкай і выканальніцкай справай.

Музычная адукацыя здзяйснялася на базе царкоўнага хора пад кіраўніцтвам даместыка. Школа-хор – распаўсюджаная форма візантыйскай прафесійнай музычнай адукацыі. Развіццю адукацыйнай практыкі спрыяла і тое, што ў IX ст. у музычна-пеўчай культуры Візантыі паявілася натацыя (неўмы), а гэта спрасціла працэс засваення богаслужэбных спеваў, набыцця прафесійна-выканальніцкіх навыкаў і засваенне звода песнапенняў. Такім чынам, ужо да канца X ст. (да пачатку хрышчэння ўсходнеславянскіх зямель) у развіцці сістэмы музычнай адукацыі набажэнскай арыентацыі на грэчаскіх і балгарскіх землях быў назапашаны пэўны вопыт: ўсталяваліся нормы выкарыстання богаслужэбных спеваў у выглядзе звода песнапенняў І.Дамаскіна, у абрадзе прымалі ўдзел прафесійныя пеўчыя, музычная адукацыя назапашвала пісьмовыя традыцыі.

Важна адзначыць, што ў праваслаўным набажэнстве музыка з’яўлялася толькі элементам, часткай сінкрэтычнага дзейства і не разглядалася як самастойная з’ява. Больш за тое, богаслужэбныя спевы музыкай не называліся, яны супрацьпастаўляліся музыцы. Музыка – гэта мірское музіцыраванне, мірскія спевы і ігра на музычных інструментах. Праваслаўныя богаслужэбныя спевы – спевы ў імя бога, служэнне богу, хвала Богу, узыходжанне да бога ў малітве, выкананне волі Бога. Таму навучанне богаслужэбным спевам - важная і патрэбная справа, якая падтрымлівалася духавенствам і дзяржаўнай уладай. Царкоўныя спевы сваімі мелодыямі павінны абуджаць малітоўны настрой, «возвышать душу к богу», а не забаўляць прыхаджан, не песціць іх слых прыемнымі гукамі, мелодыямі і гармоніямі.

Распаўсюджанне хрысціянства з канца X ст. на землях усходніх славян стала вызначальным фактарам для станаўлення інстытуалізаванай музычнай адукацыі. Кіеўская дзяржава прыняла хрысціянства ў якасці афіцыйнай дзяржаўнай рэлігіі ў 988 г. Спачатку на чале царквы ў Кіеўскім княстве стаяў мітрапаліт, які назначаўся Канстанцінопальскім патрыярхам, а ўсходнеславянская царква была часткай візантыйскай “грэка-праваслаўнай” царквы. У канцы X ст. узнікла Кіеўская мітраполія, пачалі ствараца першыя епархіі

(царкоўныя акругі) – Полацкая (каля 992 г.) і Тураўская (у 1005 г.) і інш., у якіх захоўвалася культавае адзінства. Кіеўскі мітрапаліт ставіў епіскапаў на кафедры спачатку з ліку грэчаскіх манахаў, а зрэдку – і з ліку славянскіх. Пазней епіскапаў прызначала свецкая ўлада.

Пачалі будавацца культавыя храмы і распаўсюджвацца рэлігійныя абрады праваслаўнага (грэчаскага) ўзору, запазычаныя ў Візантыі. Адпаведна, выкарыстанне музыкі ў царкоўным набажэнстве і арганізацыя музычнай адукацыі духоўнай накіраванасці адпавядала візантыйскім (грэчаскім і балгарскім) культурным традыцыям. Першы ў Кіеўскім княстве богаслужэбны хор пеўчых, які стаў узорам арганізацыі пеўчай справы, прывезла візантыйская царэўна Ганна – сястра грэчаскіх імператараў. Па яго прыкладу стварыўся хор у Ноўгарадзе, а потым у іншых гарадах і манастырах на землях усходніх славян.

У 1086 г. Князь Усевалад заснаваў Андрэеўскую царкву з жаночым манастыром, дзе ў школе пад кіраўніцтвам яго дачкі Ганны манашкамі вывучалася пісьмо, спевы і рамёствы. Традыцыі богаслужэбных спеваў зберагаліся і засвойваліся ў Кіева-Пячорскай Лаўры (заснавана ў 1051 г.), выхаванцы якой адкрывалі на беларускіх землях манастыры, працавалі ў храмах. Таму і богаслужэбныя спевы вяліся па Кіеўскаму ўзору. Пры манастырах адкрываліся школы, у якіх богаслужэбныя спевы былі абавязковым элементам зместу агульнай адукацыі.

У Кіеўскім княстве ў адпаведнасці з візантыйскімі традыцыямі ў музычнай адукацыі набажэнскай арыентацыі вылучыліся прафесійная музычная падрыхтоўка служыцеляў культу і музычная падрыхтоўка прыхаджан. У сваю чаргу, у прафесійнай музычнай адукацыі вызначыліся два профілі: падрыхтоўка кананічных спевакоў і даместыкаў.

У XIII ст. пастановай Царкоўнага сабора (1274 г.) да царкоўных спеваў на рускіх землях дапускаліся толькі спецыяльна падрыхтаваныя пеўчыя. Званне "кананічны спявак" – першая ступень царкоўнага кліра. Яны перапісвалі і выпраўлялі пеўчыя кнігі. Даместыкі (пазней – галаўшчыкі ў манастырскім хоры і першыя дзякі ў прыдворным хоры) – кіравалі пеўчым працэсам падчас богаслужэння; гэта спевакі-салісты, настаўнікі богаслужэбных спеваў, якія здзяйснялі агульнае кіраўніцтва ўсімі пеўчымі. Паступовa афарміліся некалькі формаў іх падрыхтоўкі:

- у пеўчай школе пры двары даместыкаў у Кіеве каля царквы Багародзіцы для засваення традыцый праваслаўных богаслужэбных спеваў. Гэта быў пансіён, дзе жылі і навучаліся майстэрству спеваў будучыя даместыкі. Іх вучылі сольным спевам, кіраванню хорам, навучанню пеўчых;
- у пеўчых школах пры царкоўных харах, дзе вопытныя харысты

вучылі маладых (па прыкладу Царыцына хора). Царкоўныя хары (школа-хор) –форма пеўчай школы. Так, у пеўчай школе пры Дзесяціннай царкве ў Кіеве пры князі Ўладзіміры вучылі пеўчых;

- у школах еўрапейскага ўзору пры двары Кіеўскага князя (яны не прыжыліся) і пры іншых княжаскіх дварах.

Такім чынам, асноўнымі цэнтрамі адукацыі ў Кіеўскай дзяржаве сталі манастыры і княжаскія двары, дзе вывучалі чытанне, пісьмо, богаслужэбныя спевы. Змест музычнай адукацыі ў у манастырах і княжаскіх дварах адрозніваўся: у манастырах была забаронена мірская музыка.

Што тычыцца музычнай адукацыі прыхаджан, то ім забаранялася спяваць самастойна, а дазвалялася толькі паўтараць за царкоўным клірам, у працэсе чаго і адбывалася засваенне богаслужэбных спеваў. Так на пачатковым этапе асваення візантыйскіх пеўчых традыцый музычная адукацыя праваслаўнай арыентацыі падзялілася на прафесійную (падрыхтоўка даместыкаў і пеўчых) і агульную (засваенне спеваў прыхаджанамі).

Хрысціянізацыя беларускіх земель, якая пачалася ў канцы X ст., закончылася толькі ў пачатку XIV ст. Былі заснаваны Полацкая епархія (992 г.), Тураўская (1005 г.). Цэнтрамі музычнай, як адзначалася вышэй, сталі манастыры і гарадскія цэрквы: Сафійскі сабор у Полацку (XI ст.), Благавешчанская царква ў Віцебску (XII ст.), Каложская ў Гродне (XII ст.). З распаўсюджаннем хрысціянства набажэнская практыка запатрабавала мэтанакіраванай падрыхтоўкі прафесійных пеўчых у манастырскіх і кафедральных школах і царкоўных харах.

Епіскапы Полацка і Турава прывезлі з сабой на беларускія землі клірыкаў. Смаленскі мітрапаліт у пачатку XII ст. таксама прыбыў з Візантыі і лічыцца адным з першых настаўнікаў спеваў на беларусіх землях. Вядомы дзеяч старажытнарускай культуры Кірыла Тураўскі (каля 1130–1182), акрамя павучанняў, прытчаў, “слоў”, малітваў, ствараў каноны – царкоўныя песнапенні. Такім чынам, традыцыі прафесійных богаслужэбных спеваў спачатку ўкаранялі грэчаскія і балгарскія настаўнікі, якія выкарыстоўвалі для богаслужэбных спеваў балгарскія і сербскія царкоўныя кнігі. Пераемнік Кірылы Тураўскага Лаўрэнцій забяспечваў ужо распаўсюджанне традыцый кіеўскіх богаслужэбных спеваў.

Так паступова пры цэрквах і манастырах адкрываліся школы з вывучэннем богаслужэбных спеваў. У XI ст. яны ўжо існавалі ў Полацку, Тураве, Віцебску, Смаленску, Пінску, Мазыры, Слуцку і іншых беларускіх гарадах. Тут вучылі не толькі чытаць і пісаць, але і

спяваць. Цэрквы і манастыры сталі асяродкамі пісьменнасці і музычнай адукацыі. Менавіта з дзейнасцю цэркваў і манастыроў звязваецца арганізацыя ў Беларусі (як і ва ўсёй Старажытнарускай дзяржаве) першапачатковых формаў музычнай адукацыі. Школы рыхтавалі клірыкаў і забяспечвалі ўсе хары пеўчымі. Каноны богаслужэння дыктавалі задачы і змест вакальна-харавога навучання. Так, у Полацкім манастыры існавала школа-хор, дзе пеўчыя адначасова атрымлівалі адукацыю, навыкі царкоўных спеваў, займаліся выканальніцкай пеўчай дзейнасцю. Можна меркаваць, што методыка выкладання спеваў і падрыхтоўкі царкоўных спевакоў была аднолькавай ва ўсіх пеўчых школах, што існавалі пры царкоўна-рэлігійных установах на землях усходніх славян.

Па звестках беларускіх гісторыкаў (Тарасаў С.У.), у XII ст. 25 гарадоў на беларускіх землях мелі цэрквы: у Гродне было 3 царквы, у Віцебску, Мінску, Навагародку, Валкавыску, Тураве, Пінску – па 6, у Полацку – 9. У XIII – XV стст. пры цэрках і манастырах Беларусі існаванне пеўчых школ было звычайнай з'явай. Гэтаму спрыяла і тое, што ў адпаведнасці з пастановай Царкоўнага сабора (1274 г.) да царкоўных спеваў на рускіх землях дапускаліся толькі спецыяльна падрыхтаваныя пеўчыя, што сведчыць пра існаванне сістэмы прафесійнай музычнай адукацыі набажэнскай накіраванасці, якая забяспечвала ўсе харавыя калектывы прафесійнымі пеўчымі.

Трэба, аднак, адзначыць, што ў XII ст. Кіеўская Русь распадаецца на феадальныя княствы (1132 г.), а ў 1237 – 1240 гг. амаль усе рускія землі апынуліся пад мангола-татарскім ігам і культурныя традыцыі Старажытнарускай дзяржавы ў XIII ст. атрымалі сваё далейшае развіццё пераважна ў Ноўгарадзе і ў Беларуска-літоўскай дзяржаве – Вялікім княстве Літоўскім (з 1253 г.). Праваслаўныя мітраполія на ўсходнеславянскіх землях з XIII ст. была раздзелена дзяржаўнымі межамі паміж Вялікім княствам Літоўскім (ВКЛ) і Вялікім княствам Маскоўскім (ВКМ), што з цягам часу адбілася на змесце набажэнскай практыкі і музычным афармленні царкоўнага абраду. У 1300 г. цэнтр Кіеўскай мітраполіі і рэзідэнцыя агульнарускага мітрапаліта па ініцыятыве маскоўскіх князёў была перавезена з Кіева ва Ўладзімір-на-Клязьме, а ў 1328 г. – у Маскву. Пры князе Вітаўце (1350 – 1430) ў Навагародку была заснавана незалежная ад Масквы епархія, якая напрамую падпарадкоўвалая візантыйскаму патрыярху.

На беларускіх землях хаця і была прынята візантыйская царкоўная культура, але пачаў адчувацца лацінскі культурны ўплыў. Прычына таму – сваяцкія сувязі паміж беларускімі князямі і прадстаўнікамі лацінскай культуры, шырокія гадлёвыя, ваенныя і іншыя кантакты,

палітычная кан’юнктура. Так, першы князь ВКЛ Міндоўг (1195? – 1263) спачатку прыняў праваслаўе (1246), потым каталіцтва (1251) і ў 1253 г. каранаваўся па ўзгадненні з Рымскім прэстолам, а ў 1258 г. адрокся ад хрышчэння ўвогуле. Уплыў Захаду ў музычнай адукацыі праявіўся ў тым, што на беларускіх землях былі вядомы музыкальныя танальныя сістэмы заходнееўрапейскага мастацтва, спеўная тэхніка і набажэнскія спевы каталіцкай царквы. Гэтаму спрыяла распаўсюджанне ў Еўропе націраваных рукапісаў (з IX ст.) і, адпаведна, Грыгарыянскіх спеваў у пісьмовай традыцыі.

Шырокае распаўсюджанне на беларускіх землях каталіцызм атрымаў у другой палавіне XIV ст., асабліва пасля Крэўскай уніі 1385 г., калі вялікі князь ВКЛ Ягайла (1348 – 1434) ажаніўся з польскай каралевай Ядвігай і стаў польскім каралём (праводзілася палітыка акаталічвання і паланізацыі насельніцтва ВКЛ). Ён хрысціў апошніх у княстве язычнікаў і заснаваў у 1387 г. Віленскае біскупства, якое ахоплівала літоўскія і большую частку беларускіх зямель. У княстве распаўсюдзіліся манастырскія і кафедральныя каталіцкія школы (самая першая з іх, Віленская, узнікла ў 1387 – 1388 г.). У адказ на гэта мітраполія ВКМ імкнулася да “вызвалення” праваслаўнага насельніцтва ВКЛ ад “каталіцкага прыгнёту”, што вызначала палітычныя адносіны паміж двума княствамі.

У ВКМ не прымалі музычна-пеўчыя прынцыпы Захаду. Рускае духавенства асуджала богаслужэбныя спевы ў каталіцкай царкве і разглядала іх як музыку, у якой спалучаліся вакальны і інструментальны пачаткі. Музычная практыка была несумяшчальнай з хрысціянствам, таму ў праваслаўных кнігах апісвалі малітоўны стан, а не тэарэтычныя і эмацыянальныя аспекты музычнага мастацтва. У той жа час на беларускіх землях каталіцкая і праваслаўная традыцыі богаслужэбных спеваў мірна суіснавалі, больш за тое, праваслаўныя богаслужэбныя спевы у другой палове XVI ст. трансфармаваліся пад уплывам заходнееўрапейскіх традыцый.

Аналіз літаратурных крыніц дазваляе саставіць уяўленне пра змест і сродкі музычнай адукацыі таго часу. Яна спачатку мела стылявую накіраванасць. У змест адукацыі ўваходзіла засваенне трох стылявых накірункаў царкоўна-пеўчага мастацтва – распеўнае чытанне, знаменныя і кандакарныя спевы у пазначаным парадку. У канцы XI – XIV стст. сфарміраваліся аднагалосы знаменны распеў і адпаведная безлінейная натацыя. Чытанне нараспеў засвойвалася ў асноўным вусным шляхам, а далей – на аснове пісьмовай традыцыі. Кожнаму музычнаму стылю богаслужэбных спеваў адпавядала асобая разнавіднасць безлінейнай натацыі неўменнага тыпу: экфанетычная і кандакарная – да XIV ст.; знаменная – да XVII ст.; “путевая”, “демественная” – з XVII ст.

Старажытная руская музычна-педагагічная думка і музычна-адукацыйная практыка былі арыентаваны на асваенне знаменнай сістэмы спеваў, характэрнай менавіта Рускай Праваслаўнай царкве. Знаменная сістэма натацыі богаслужэбных спеваў была найбольш распаўсюджанай. У сістэме натацыі прыярытэт аддаваўся духоўнаму пачатку, а не музыкальнаму. Знамёны фіксавалі не толькі музыкальныя параметры, але былі і духоўнымі арыенцірамі, настройвалі на малітоўны стан душы. Духоўны пачатак (а не музычны) быў прыярытэтным у знаменных распевах. Натацыя – дапаможны сродак духоўных спеваў, а асваенне музыкальнай пісьменнасці – гэта паглыбленне ў духоўнасць.

Пеўчыя засвойвалі некалькі натацый. Кандакарныя запісы суправаджаліся хейранамічнымі знакамі – графічным абазначэннем жэстыкуляцыі – хіранаміі), якая выкарыстоўвалася ў Візантыі кіраўнікамі царкоўных хораў у выканальніцкай практыцы і пры навучанні спевакоў. Тэхнічныя задачы вакальна-харавога навучання вырашаліся спевакамі на падсвядомым узроўні падчас спеваў, бо галоўным была ўстаноўка на малітоўны стан.

Першыя кнігі для навучання пеўчых былі ненаціраванныя, але з указаннямі, што сведчыць пра элементы пісьменнай традыцыі. Пеўчыя пераймалі па слыху спевы настаўніка і адначасова чыталі тэкст і ўказанні ў кнізе. У канцы XI – пачатку XII стст. паявіліся націраванныя пеўчыя кнігі. У XII ст. у Візантыі адбылася рэформа натацыі: кожная неўма абазначала асобную ноту. Славесны тэкст суправаджаўся "музыкальным радам" неўменнай_натацыі візантыйскага тыпу. З XIII ст. музыка стала галоўным сродкам у развіцці тэматыкі тэкста, а стваральнікамі песнапенняў сталі музыканты. Сярод пеўчых кніг, якія выкарыстоўваліся ў навучанні, – спачатку Ірмалогій, Сціхірарь, Мінея; з XV ст. – Актоіх, з XV – XVI ст. – Абіход.

У XI – XIV стст. былі закладзены асновы методыкі навучання праваслаўным богаслужэбным спевам, якая базіравалася на наступных падставах: тэкставага матэрыяла на славянскай мове, які быў падрыхтаваны балканскімі славянамі да канца X ст.; гатовых "осмогласных" напеваў праваслаўнага Усходу з крукавай натацыяй у богаслужэбных нотных кнігах; спосабаў і відаў царкоўных спеваў Усхода, адзіночнага і харавога; строгага вакальнага характара спеваў, з прыярытэтам мелодыі і адсутнасцю гарманічнага суправаджэння.

У методыцы вакальна-харавога навучання богаслужэбнай арыентацыі паступова вылучыліся некалькі этапаў засваення выканальніцкіх навыкаў: інтаніраванне аднаго гука, іх паслядоўнасцей, ладавых апор; развіццё ладавага і дынамічнага дыяпазонаў голасу, яго тэмбра; фарміраванне навыкаў выразнага выканання тэкста, калектыўнага выканання.

Такім чынам, у XI – XIV стст. на беларускіх землях фарміруецца сістэма прафесійнай (падрыхтоўка пеўчых) і агульнай (падрыхтоўка прыхаджан) музычнай адукацыі. Школа-хор, манастырская і прыходская школы з'яўляюцца вядучай формай прафесійнага навучання богаслужэбным спевам; спяванне малітваў у хоры з'яўлялася асноўнай формай агульнай музычнай адукацыі для прыхаджан; перадача вопыту ў хоры пераважна была вуснай; калектыўныя метады навучання спалучаліся з індывідуальнымі. Закладваліся асновы методыкі вакальна-харавога навучання праваслаўным богаслужэбным спевам; музычна-адукацыйная практыка была арыентавана на асваенне пераважна знаменнай сістэмы спеваў. Пры падрыхтоўцы прафесійных пеўчых выкарыстоўваліся розныя сістэмы натацыі, ненаціраваныя і націраваныя пеўчыя кнігі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Густова, Л. А. Музыкально-певческая кльтура православной церкви Беларуси / Л. А.Густова. – Минск : Бестпринт, 2006. – 170 с.
2. Кузьмініч, М. Л. Гісторыя музычнага выхавання і адукацыі (ад старажытнасці да XIX ст.) / М. Л. Кузьмініч. – Мінск : Бел. ун-т культуры, 2000. – 188 с.
3. Николаева, Е. В. История музыкального образования : Древняя Русь : конец X – середина XVII столетия / Е. В. Николаева. – М. : ВЛАДОС, 2003. – 208 с.
4. Пракапцова, В. П. Спасціжэнне майстэрства : Станаўленне мастацкай адукацыі ў Беларусі / В. П. Пракапцова. – Мінск : Мін. ф-ка каляр. друку, 2006. – 208 с.
5. Штыхаў, Г. Кіеўская Русь / Г. Штыхаў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4. Кадэты – Ляшчэня / Рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1997. – С. 169 – 172; іл.